ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ

“ГІМНАЗІЯ Г. СМАРГОНІ”

Конкурс матэрыялаў па рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу ўрока

Намінацыя "Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне"

# Прэзентацыя “Старонкі азбукі Смаргоншчыны” як сродак выхавання пачуцця патрыятызму на ўроках беларускай мовы і літаратуры

Аўтары:

Букліс Лілія Эдвардаўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія г. Смаргоні”

Красоўская Ядвіга Баляславаўна, загадчык народнага гісторыка-краязнаўчага музея "Гісторыя. Падзеі. Людзі"

2022

Вучэбная праграма па беларускай мове прадугледжвае дасягненне вучнямі адукацыйных і асобасных вынікаў навучання: валоданне мовай як сродкам пазнання свету, далучэнне да культуры, традыцый народа, валоданне пачуццём патрыятызму, грамадзянскасці...

Багатым выхаваўчым патэнцыялам валодаюць культуразнаўчыя тэксты. Уменне працаваць з тэкстамі розных тыпаў і стыляў, пісьменнасць, агульнакультурная і чытацкая кампетэнтнасць – усё гэта становіцца ў будучым асновай прафесійнага росту. Асновай для фарміравання арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў, развіцця звязнага маўлення на ўроках беларускай мовы з’яўляецца тэкст. Тэксты, складзеныя на мясцовым матэрыяле, далучаюць навучэнцаў да патрыятычнага выхавання праз прывіццё любові, павагі, гонару за сваю малую Радзіму.

Галаўная задача настаўніка-моваведа – не толькі навучыць, але і паказаць, дзе і як могуць быць ужытыя атрыманыя веды, павысіць цікавасць да свайго прадмета, да духоўнай спадчыны народа. Таму дадзены матэрыял мае на мэце спрыяць выхаванню гонару і павагі да свайго краю, яго насельнікаў.

Задачы:

- стварыць умовы для выхавання цікавасці да гісторыі сваёй малой Радзімы і яе яркіх прадстаўнікоў;
- прыцягнуць ўвагу навучэнцаў да адраджэння і захавання духоўных каштоўнасцей;
- садзейнічаць развіццю камунікатыўных навыкаў і творчых здольнасцей вучняў.

Прэзентацыя “Старонкі азбукі Смаргоншчышы” ўключае інфармацыю аб

вядомых дзеячах Смаргоншчыны, дзе размешчаны фота матэрыялы, спасылкі на кнікі аўтараў, QR-коды на дадатковы матэрыял і відэа. Прэзентацыя размешчана ў сетцы Інтэрнэт і дапоўнена інтэрактыўнай віктарынай “Сваім талентам праславілі наш край”.

Дадзены дыдактычны матэрыял можна выкарыстоўваць пры вывучэнні наступных тэм: "Функцыянальныя стылі маўлення", "Стылеўтваральныя моўныя сродкі", "Нормы сучаснай беларускай мовы" (11 клас); "Тыпы маўлення", "Тэкст як адзінка мовы і маўлення", "Прыметы тэксту" (10 клас); "Падагульняючыя ўрокі" (у 9 - 11 класах). Гэта добры матэрыял для пазакласнай работы (як для вучняў сярэдняга звяна, так і для старэйшых класаў).Таксама яго можна выкарыстаць на факультатыўных занятках, на класных і інфармацыйных гадзінах.

**Прэзентацыя “Старонкі азбукі Смаргоншчышы”**

**https://www.calameo.com/books/0010873805aa211a51d62**

**Інтэрактыўная віктарына “Сваім талентам праславілі наш край”**

**https://wordwall.net/ru/resource/16652289**

ДАДАТАК

**Музейны ўрок у Х класе “Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці слоў і іх формаў”**